





# Найлепшыя ў культурнай галіне





**лета** за музычны спектакль “Дзікае паляванне караля Стаха”.

У намінацыі конкурсу “Найлепшая канцэртная праграма, прадстаўленне патрыятычнай тэматыкі” пераможцамі сталі **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў** за эстрадную праграму для ўдзельнікаў VI Усебеларускага народнага сходу “Мы — народ...”, а таксама за харэаграфічную канцэртную праграму “Насустрач пачуццям і думкам крылатым”, і **Маладзёжны тэатр эстрады** за музычную канцэртную праграму — народнае шоу “Песні маёй краіны свята “Купалле” (“Александрыя збірае сяброў”).

У намінацыі “Найлепшы фільм патрыятычнай тэматыкі” пераможцамі сталі **аўтарскі калектыў у складзе Вячаслава Бандарэнкі, Дзмітрыя Сарокі і Ганны Апсіт** за стужку “Рана на целе Беларусі”. А за анімацыйную стужку “263 ночы” пераможцамі конкурсу сталі **Канстанцін Андрушачкін і Святлана Кавалеўская.**

У намінацыі “Найлепшы твор выяўленчага мастацтва патрыятычнай тэматыкі” пераможцамі сталі **аўтарскі калектыў ваенных мастакоў пры Цэнтральным Доме афіцэраў — Мікалай Апёк, Уладзімір Уродніч, Георгій Лойка Уладзімір Гардзеенка і Аляксандр Асядоўскі** за серыю твораў “Служым Айчыне”. Таксама тут сталі найлепшымі члены **Беларускага саюза мастакоў Ларыса Журавовіч** за серыю графічных работ “Вяртанне”, **Валерый Малахаў** за манументальна-дэкаратыўны барэльеф “Апошнія абдымкі” для мемарыяльнага комплексу “Ала” Светлагорскага раёна і **Сяргей Гумілеўскі** за скульптурны партрэт Янкі Купалы “Мне сняцца сны аб Беларусі”.

У намінацыі “Найлепшае культурнае мерапрыемства народнай творчасці патрыятычнай тэматыкі” пераможцамі сталі **Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, народны тэатр “Пілігрым” Полацкага гарадскога Палаца культуры** за стварэнне аматарскага праекта “Тэатральная кампазіцыя “Усё жыццё — подзвіг”, **аўтарскі калектыў Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці ў складзе Ірыны Глушэц, Людмілы Мельнікавай і Наталлі Сафрановіч** за стварэнне праекта народных рамёстваў “Выстава-прэзентацыя “Жывая спадчына Гомельшчыны” і **аўтарскі калектыў Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці ў складзе Кацярыны Лабуко, Вольгі Мульц і Васіля Медзюхі** за стварэнне праекта для моладзевай аўдыторыі “Патрыятычная акцыя “Дарогамі памяці”.

У намінацыі “Найлепшы музейны праект патрыятычнай тэматыкі” пераможцамі сталі **Лідскі гісторыка-мастацкі музей** за стварэнне інклюзіўнага праекта “Перадай дабро па крузе”, **Гомельскі палаца-паркавы ансамбль** за стварэнне культурна-асветніцкага праекта “Лета ў археалогіі” і **Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. Суворава** за стварэнне інтэрактыўнага гісторыка-краязнаўчага праекта “Знаёмцеся — сваха!”

Пераможцамі ў намінацыі “Найлепшы інтэрактыўны бібліятэчны праект патрыятычнай тэматыкі” сталі **Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна** за стварэнне культурна-асветніцкага праекта сярод абласных бібліятэк “Вызваленне Віцебскай вобласці. 1943-1944 гг.”, **Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк** горада Магілёва за стварэнне мультымедыйнай ETHNO-LIT-праграмы “Бібліятэка-TRIBUTE” сярод раённых і гарадскіх бібліятэк, і сярод сельскіх бібліятэк — **Казлоўшчынская гарпасялковая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры “Дзятлаўская раённая бібліятэка”** за стварэнне краязнаўчага інтэрнэт-праекта “Нашы суайчыннікі”.

За актыўны ўдзел у правядзенні значных грамадска-культурных мерапрыемстваў Ганаровай граматай Міністэрства культуры ўзнагароджаныя **кампазітар, музыкант гурта “Аўра” Яўгеній Алейнік, эстрадная спявачка, вакалістка гурта “Аўра” Юлія Быкава, Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта “Крыжачок” , Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль “Харошкі”, Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя Іосіфа Жыновіча, Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча.**

Граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь узнагароджаныя **старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Дзмітрый Бяззубенка, рэжысёр-пастаноўшчык Яна Калачынская, мастак-пастаноўшчык Іна Лазарава, старшы выкладчык установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” Агата Мацко, мастацкі кіраўнік творчай майстэрні эстраднага мастацтва “Хвілінка” Таццяна Панова, загадчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Людміла Ражкова і Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, фальклорная група “Купалінка”.**

Падзяка міністра культуры Рэспублікі Беларусь была абвешчаная **настаўніку дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 10 імя Яўгена Глебава г.Мінска Галіне Аеравай, навуковаму супрацоўніку мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” Арцёму Даўгуну, дырэктару дзяржаўнай установы “Мінскканцэрт” Паўлу Дварэцкаму, студэнту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Арцёму Дзеравягу, рэжысёру тэлебачання галоўнай дырэкцыі тэлеканала “Беларусь 2” Белтэлерадыёкампаніі Даніілу Жданько, вядучаму канцэрта, салісту Вялікага тэатра Беларусі Вользе Кажгалііевай, навуковаму супрацоўніку мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” Ігару Калашнікаву, настаўніку дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 10 імя Глебава г.Мінска Аляксею Клімовічу, старшаму выкладчыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Яўгену Курчыну, дырэктару Музея гісторыі горада Мінска Галіне Ладзісавай, вядучаму метадысту дзяржаўнай установы “Мінскканцэрт” Ларысе Насановіч, намесніку галоўнага дырэктара Агенцтва тэлевізійных навін, вядучай Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь Вікторыі Пупко, старшыні рэспубліканскага грамадскага аб’яднання “Патрыёты Беларусі” Сяргею Рачкоўскаму, дацэнту Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Тамары Слабодчыкавай, дырэктару Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Глінкі Аляксею Сытко, мастацкаму кіраўніку Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь, узорнага тэатра эстраднай песні “Сябрынка” Палаца культуры Мінскага аўтамабільнага завода Таццяне Трухан, намесніку старшыні рэспубліканскага грамадскага аб’яднання “Патрыёты Беларусі” Ганне Харута, архіерэйскаму хору мінскага Свята-Духава Кафедральнага сабора і прыватнаму канцэртнаму ўнітарнаму прадпрыемству “Прадзюсарскі цэнтр “Спамаш”.**

Фота з калегіі — Таццяны МАТУСЕВІЧ

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ